# БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ КАВАЛЬСТВА



Я. М. САХУТА

# БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ КАВАЛЬСТВА

Мінск
«Беларусь»
2015

УДК 739.4(476)
ББК 85.125(4Беи)
С22

І л ю с т р а ц ыі: *Я. М. Сахута*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар мастацтвазнаўства, прафесар *В. І. Жук*,
доктар мастацтвазнаўства, прафесар *Р. Ф. Шаура*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**ISBN 978-985-01-1131-9**

© Сахута Я. М., 2015
© Издательство «Беларусь», 2015

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ . . . . . . . . 6

З ГІСТОРЫІ КАВАЛЬСТВА Ў БЕЛАРУСІ . . . . . . . . 10

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ТЭХНІКІ І ТЭХНАЛОГІІ РАМЯСТВА . . . . . . . . 50
- Кузня і яе абсталяванне . . . . . . . . 53
- Інструменты і матэрыялы . . . . . . . . 56
- Асноўныя тэхналагічныя працэсы . . . . . . . . 62

КАВАЛЬСКІЯ ВЫРАБЫ Ў НАРОДНЫМ ПОБЫЦЕ . . . . . . . . 70
- Падкоўванне коней . . . . . . . . 74
- Кавальства ў народным дойлідстве . . . . . . . . 75
- Акоўка транспартных сродкаў . . . . . . . . 117
- Кавальскія вырабы гаспадарчага прызначэння . . . . . . . . 123

СУЧАСНАЕ МАСТАЦКАЕ КАВАЛЬСТВА . . . . . . . . 146

ЗАКЛЮЧЭННЕ . . . . . . . . 166

КАРОТКІ ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК . . . . . . . . 170

# УВОДЗІНЫ



Сярод розных традыцыйных рамёстваў, здаўна пашыраных у народным побыце беларусаў, кавальства лічылася адным з самых паважаных і неабходных. Без уласнага майстра-каваля не абыходзілася ніводнае паселішча. Падкаваць каня, назубіць серп, адцягнуць нарог, адкаваць матыку ці завесу — ішлі да каваля. Добрага майстра ведала ўся акруга, ім ганарыліся, яго шанавалі і цанілі. Кавальскае рамяство заўсёды было акружана арэолам таямнічасці і загадкавасці, а каваля параўноўвалі з чараўніком, які валодае цудадзейнымі сакрэтамі апрацоўкі такога непадатлівага матэрыялу, як жалеза. Несумненна, ад прафесійнага занятку продкаў паходзяць прозвішчы Кавалевіч, Кавалёў, Кавальчук, Кавалёнак, Кавалік, Каваленя, Кавальскі, а таксама назвы паселішчаў Кавалі, Кавальцы, Кавалёва, Кавалевічы, якія трапляюцца ў кожным кутку Беларусі.

Пра пашыранасць кавальскага рамяства ў мінулым сведчаць таксама яго шматлікія ўцалелыя ўзоры. У старой гарадской забудове можна пабачыць адмыслова адкаваныя балконы, агароджы, вароты, у кожнай сялянскай гаспадарцы трапіцца якая-небудзь выкаваная з металу прылада працы, бытавая рэч, мацаванне частак збудавання або транспартнага сродку. Часам такія вырабы маюць настолькі адмысловыя формы і дэкор, што могуць адносіцца да твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Але ў большасці выпадкаў узоры традыцыйнага кавальскага рамяства канструктыўна простыя, сціплыя ў дэкаратыўных адносінах. Відаць, таму яны не прыцягвалі да сябе асаблівай увагі даследчыкаў матэрыяльнай і асабліва мастацкай культуры народа, якія бачылі ў кавалях звычайных рамеснікаў, што задавальнялі неабходныя бытавыя, практычныя патрэбы насельніцтва. Гісторыкі і этнографы, калі і звярталіся да кавальства, разглядалі яго ў

шэрагу іншых рамёстваў утылітарнага, гаспадарчага характару. Таму на сённяшні дзень традыцыйнае кавальства — ці не найменш даследаваны від беларускага народнага рамяства. Калі ткацтва, ганчарства, пляценне, дрэваапрацоўка апошнім часам атрымалі належнае асвятленне ў шматлікіх публікацыях і нават асобных выданнях, то пра кавальства амаль нічога няма. Сярод колішніх публікацый варта згадаць хіба грунтоўны раздзел пра кавальскае рамяство ў вядомай працы Ч. Пяткевіча «Рэчыцкае Палессе»[1], матэрыялы з якога ў скарочаных варыянтах паўтараюцца ў сучасных этнаграфічных выданнях па беларускіх народных промыслах і рамёствах.

Між тым неабходнасць у спецыялізаваным выданні пра беларускае народнае кавальства як традыцыйнае рамяство наспела даўно. Перш за ўсё — каб запоўніць яшчэ адну чыстую старонку ў гісторыі культуры Беларусі. Як і многія іншыя традыцыйныя рамёствы, кавальства ў другой палове XX ст. зазнала перыяд імклівага заняпаду, неўзабаве ў сваім традыцыйным выглядзе яно і ўвогуле амаль перастала бытаваць. Ужо ў 1970—1980-я гг. няпроста было адшукаць старую кузню з усім начыннем. Праўда, практычна ў кожнай калгаснай ці саўгаснай гаспадарцы былі майстры-кавалі, для якіх звычайна абсталёўвалі кузні ў складзе рамонтна-механічных майстэрняў. Але дзейнасць іх зводзілася галоўным чынам да прасцейшага рамонту рознай сельскагаспадарчай тэхнікі і інвентару. Сапраўдныя патомныя майстры сярод іх трапляліся ўсё радзей, ды і яны не мелі стымулаў для развіцця сваіх здольнасцей: з насычэннем рынку прамысловай прадукцыяй патрэба ў кавальскіх вырабах у народным побыце практычна знікла. Пры гэтым разам з майстрамі старэйшага пакалення адыходзілі ў нябыт рамесніцкія навыкі, забываліся даўнія традыцыі кавальства, асаблівасці і сакрэты рамяства. У той жа час у грамадстве расла цікавасць да набыткаў традыцыйнай культуры, колішніх рамёстваў і промыслаў — як яшчэ жывых, так і тых, якім пагражаў заняпад ці ўвогуле поўнае знікненне пад наступам навукова-тэхнічнага прагрэсу. Таму першае і неадкладнае, што тут трэба рабіць, — збіраць уцалелыя матэрыялы, узоры вырабаў, вусную інфармацыю пра тыя ці іншыя традыцыйныя рамёствы з тым, каб каштоўныя набыткі мінулага, па-першае, не аказаліся страчанымі назаўсёды, па-другое, маглі быць даступнымі ўсім, каго цікавіць нацыянальная культура.

Але сённяшняя цікавасць да кавальства як аднаго з найстаражытных і калісьці пашыраных відаў традыцыйных рамёстваў выклікана не толькі жаданнем, пакуль не позна, запоўніць «белую пляму» ў гісторыі культуры Беларусі. Сёння, на хвалі нацыянальна-культурнага адраджэння, набываюць новае жыццё многія забытыя рамёствы, у тым ліку і кавальства, якое ўжо на новым узроўні актыўна ўключаецца ў сучасныя культурныя працэсы. За кавальскі горан становяцца маладыя майстры, вырабы якіх шырока выкарыстоўваюцца ў аздабленні грамадскіх збудаванняў, сядзібным будаўніцтве, у рэстаўрацыйнай справе ці проста як арыгінальныя творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Добра дасведчаныя ў тэхналагічных і мастацкіх набытках рамяства ў цэлым свеце, многія майстры пры гэтым хочуць ведаць і нацыянальныя традыцыі, творчыя набыткі ўласных продкаў-кавалёў. Несумненную дапамогу ў гэтым могуць аказаць даследаванні, публікацыі і выданні па гэтай тэме, у тым ліку, думаецца, і гэтая кніга — першае выданне па беларускаму народнаму кавальству.

Прапануемая кніга не прэтэндуе на паўнату ахопу матэрыялу і не з'яўляецца дапаможнікам па кавальскаму рамяству. Усім, хто

[1] Пяткевіч Ч. Рэчыцкае Палессе / пераклад з польск. Л. Салавей і У. Васілевіча. — Мінск, 2004.

жадае авалодаць тэхналагічнымі сакрэтамі кавальства, няцяжка адшукаць разнастайныя спецыялізаваныя выданні, якіх сёння больш чым дастаткова. Праўда, усе яны — замежныя, але ў дадзеным выпадку гэта не надта прынцыпова, паколькі тэхналогія рамяства досыць уніфікаваная. Асноўная ж задача кнігі — пазнаёміць з мастацкімі, практычнымі і іншымі набыткамі і традыцыямі кавальства менавіта ў Беларусі.

Асноўная колькасць матэрыялу да кнігі сабрана аўтарам у выніку экспедыцый і паездак па Беларусі ў 1980-я гг. Тады яшчэ ўдалося заспець многіх колішніх майстроў-кавалёў старэйшага пакалення, якія ў большасці выпадкаў рамяством ужо даўно не займаліся, але добра памяталі ўсё, што з ім звязанае. Яны і сталі каштоўнай крыніцай інфармацыі па традыцыйнаму кавальскаму рамяству, яго ж узоры яшчэ траплялiся і ў колішнім сялянскім побыце. Частка сабранага матэрыялу, які выразна дэманстраваў мастацкія набыткі ў гэтай галіне, склала аснову кнігі пра народнае мастацкае кавальства[2]. У прапануемае ж выданне ўключана ўсё, што датычыць кавальства як традыцыйнага народнага рамяства: асаблівасці тэхналогіі, асартымент кавальскіх вырабаў, іх выкарыстанне ў народным побыце і інш. Зразумела, не абыдзеныя ўвагай тыя нешматлікія гістарычныя, этнаграфічныя, мастацтвазнаўчыя крыніцы і выданні, дзе трапляюцца хоць якія звесткі пра кавальскае рамяство на нашых землях, а таксама рэчавыя матэрыялы, што зберагаюць некаторыя музеі: Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (БДМНАП), Музей старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (МСБК), Нацыянальны гістарычны музей (НГМ) і інш.

Асноўны матэрыял кнігі ахоплівае пераважна канец XIX — першую палову XX ст. — перыяд найбольш значнага развіцця кавальства як традыцыйнага народнага рамяства беларусаў. Але яго вытокі куды больш глыбокія, а набыткі, звязаныя з гарадскімі, цэхавымі, мануфактурнымі рамёствамі, — багатыя, значныя і адметныя. Паколькі традыцыйны народны побыт беларусаў не быў адгароджаны ад горада і заўсёды пераймаў у яго ўсё, што адпавядала мясцовым густам, традыцыям і патрэбам, можна лічыць таксама неабходным агульны агляд кавальскага рамяства на працягу ўсёй яго гісторыі ў Беларусі.

---

[2] Сахута Я. М. Беларускае народнае мастацкае кавальства. — Мінск, 1990.

# КАРОТКІ ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК



*Адпусканне* — павышэнне мяккасці і пластычнасці стальной загатоўкі або часткі вырабу шляхам яе нагрэву і павольнага ахалоджвання (звычайна на паветры або разам з горнам).

*Акант* — арнаментальны матыў у выглядзе ліста аканта — расліны, пашыранай у Міжземнамор'і. Доўгія зубчастыя лісты кампануюцца ў хвалісты арнамент, спіралепадобна закручваюцца, збіраюцца ў пучок у форме чашы і інш. Пашыраны ў архітэктуры Рэнесансу, барока, класіцызму.

*Ампір* (ад франц. *empire* — імперыя) — стыль у еўрапейскім мастацтве першай трэці XIX ст., які завяршыў развіццё класіцызму. Склаўся ў Францыі ў часы Першай імперыі (1804—1815). Творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва вызначаюцца статычнай маналітнай формай, з якой кантрастуюць арнаментальныя ўстаўкі, выявы грыфонаў, лебедзяў, ільвоў, ваенная эмблематыка і інш.

*Барока* (ад італ. *barocco* — вычварны, дзівосны) — стыль у еўрапейскім мастацтве канца XVI — сярэдзіны XVIII ст. Творы ў гэтым стылі вызначаюцца дынамічнасцю кампазіцыі, пышнасцю дэкору, кантрастам маштабаў, рытмаў, матэрыялаў і фактур. Узнік на аснове традыцый позняга Рэнесансу, папярэднічаў класіцызму.

*Бура* — хімічнае злучэнне ў выглядзе белага парашку. Выкарыстоўвалася ў якасці флюсу пры зварцы сталі з меддзю.

*Валюта* — архітэктурны матыў у выглядзе спіралепадобнага завітка, якім звычайна завяршаліся калоны; *валютападобны* — у выглядзе завітка.

*Высадка* — спосаб патаўшчэння часткі металічнага стрыжня. Яго разагравалі ў патрэбным месцы, ставілі на кавадла і білі малатком па другім канцы: нагрэты ўчастак раздаваўся ўбакі.

*Готыка* (ад назвы германскага племя готаў) — стыль у еўрапейскім мастацтве XII—XVI стст., папярэднічаў Рэнесансу. Творы ў гэтым стылі (пераважна архітэктура і дэкаратыўна-прыкладныя вырабы) вызначаюцца імклівасцю і стромкасцю форм, узбагачаных насычаным ажурным дэкорам, у якім пераважаюць крыжападобныя матывы.

*Гута* — даўнейшая назва шклозавода. Часам так называлася і рудня.

*Гутнік* — майстар-шклавар. Часам так называўся і руднік.

*Жалеза* — мяккая малавугляродзістая сталь.

*Загартоўка* — павышэнне цвёрдасці стальной загатоўкі ці часткі вырабу шляхам яе нагрэву і хуткага ахалоджвання (звычайна ў вадзе або масле).

*Зварка (кавальская)* — спосаб злучэння асобных частак у адно цэлае, які заключаўся ў скоўванні на кавадле разагрэтых да жоўтага колеру загатовак ці зламаных частак нейкага вырабу.

*Інкрустацыя* — дэкараванне вырабаў урэзаным ў яго паверхню малюнкам ці арнаментам з іншых матэрыялаў: кавалачкаў дрэва, косці, металу, перламутру і інш.

*Класіцызм* (ад лац. *classicus* — узорны) — стыль у еўрапейскім мастацтве другой паловы XVII — пачатку XIX ст. (у мастацтве Беларусі — другой паловы XVIII — пачатку XIX ст.). Прыйшоў на змену ракако. Скарыстоўваў дасягненні антычнага мастацтва як класічныя ўзоры. Творы ў стылі класіцызму вызначаюцца строгасцю і прастатой форм з тонкім, стрыманым дэкорам.

*Крыца* — бясформенны камяк жалеза, які атрымліваецца пры выплаўцы яго з жалезнай руды.

*Мадэрн* (ад франц. *moderne* — найноўшы, сучасны) — адна з назваў стылявога кірунку ў еўрапейскім і амерыканскім мастацтве канца XIX — пачатку XX ст. На Беларусі меў таксама назву сецэсія (ад лац. *secessio* — адыход, адступніцтва). Прапагандаваў адыход ад старых, закасцянелых форм і зварот да запатрабаванняў новага часу. Творам у стылі мадэрн уласцівы мудрагеліста выгнутыя, пераплеценыя лініі, цякучыя формы, асіметрычныя кампазіцыі, падкрэсленыя дэкаратыўнасць і сімвалізм.

*Меандр* — геаметрычны стужкавы арнамент у выглядзе ламанай пад прамым вуглом лініі. Шырока вядомы ў мастацтве Старажытнай Грэцыі, у беларускім мастацтве пашыраны ў пачатку XX ст. у стылі мадэрн.

*Насечка* — інкрустацыя металам па металу (напрыклад, меднымі ці сярэбранымі пласцінамі на вырабах са сталі).

*Настальванне* — наварванне стальной пласціны на жалезную аснову (напрыклад, пры вырабе сярпа або сякеры).

*Пальмета* — арнаментальны матыў у выглядзе сіметрычнага стылізаванага веерападобнага ліста пальмы.

*Ракако* (ад франц. *rococo*) — стыль у еўрапейскім мастацтве першай паловы XVIII ст. У процілегласць манументальнасці і пышнасці барока творы ў стылі ракако ствараюць уражанне лёгкасці, вытанчанасці, грацыёзнасці. Папярэднічаў класіцызму.

*Рудня* — даўнейшая назва месца ці памяшкання для выплаўкі жалеза з балотнай руды.

*Руднік* — майстар па выплаўцы жалеза з руды.

*Рэнесанс* (ад франц. *renaissance* — адраджэнне) — эпоха ў развіцці шэрагу краін Еўропы XIV—XVI стст. (у Беларусі — XVI —

першая палова XVII ст.), пераходная ад сярэдневяковай культуры да культуры новага часу. Мастацтва вызначаецца зваротам да антычнай культурнай спадчыны, свайго роду адраджэннем яе (адсюль і назва). Мастацтва Беларусі эпохі Рэнесансу арганічна спалучае рысы позняй готыкі і ранняга барока.

*Сталь* — сплаў жалеза з вугляродам і іншымі элементамі. Працэнт вугляроду вагаецца ад 0,1 да 1,5 працэнта і вызначае цвёрдасць сталі. Пры колькасці вугляроду да 0,1 працэнта сталь вельмі мяккая, у практыцы яе называюць жалезам.

*Тарсіраванне* — спосаб дэкаратыўнай апрацоўкі каваных вырабаў, які заключаецца ў вінтападобным скручванні гранёнага стрыжня вакол падоўжнай восі.

*Флюс* — спецыяльны дадатак для аддзялення шлаку пры гарачай апрацоўцы металаў. У народным кавальстве ў якасці флюсаў скарыстоўвалі чысты рачны пясок.

*Цэментацыя* — насычэнне вугляродам паверхневага слою вырабаў з жалеза для павышэння іх цвёрдасці і пругкасці.



САХУТА Яўген Міхайлавіч — беларускі вучоны ў галіне мастацтвазнаўства і этналогіі. Вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар. Асноўныя напрамкі навукова-даследчыцкай зацікаўленасці — тэорыя, гісторыя і сучасны стан беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйных мастацкіх рамёстваў і промыслаў. Аўтар манаграфій «Народная разьба па дрэву» (1978), «Беларуская народная кераміка» (1987), «Беларускае народнае мастацкае кавальства» (1990), «Народнае мастацтва Беларусі» (1997), «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» (2005), «Беларуская выцінанка» (2008), «Беларускае народнае мастацтва» (2011), «Сучаснае народнае мастацтва Беларусі» (2013), «Беларускае народнае ганчарства» (2013) і інш., а таксама шматлікіх публікацый, артыкулаў, раздзелаў у калектыўных працах, зборніках, энцыклапедычных выданнях, перыёдыцы.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996), прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2008).

**Сахута, Я. М.**
С22 Беларускае народнае кавальства / Я. М. Сахута. — Мінск : Беларусь, 2015. — 174 с. : іл.
ISBN 978-985-01-1131-9.

Выданне прысвечана аднаму з найстаражытных, калісьці пашыраных, затым амаль забытых, а сёння адроджаных рамёстваў Беларусі — кавальству. Коратка асвятляецца яго гісторыя на тэрыторыі Беларусі ад вытокаў да нашага часу, разглядаюцца традыцыйныя тэхнікі і тэхналогіі рамяства, характарызуюцца найбольш тыповыя і пашыраныя ўзоры кавальства.

Адрасуецца даследчыкам матэрыяльнай культуры Беларусі, супрацоўнікам музеяў, рэстаўратарам, майстрам-кавалям, усім, хто цікавіцца традыцыйнай культурай і народнымі рамёствамі, шырокаму колу чытачоў.

**УДК 739.4(476)**
**ББК 85.125(4Беи)**

Навуковае выданне

**Сахута** Яўген Міхайлавіч

**БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ КАВАЛЬСТВА**

Рэдактар *Ю. А. Аверчанка*
Мастацкае афармленне *В. Г. Паўлаўца*
Мастацкі рэдактар *В. Г. Загародні*
Тэхнічны рэдактар *Ж. М. Бароўская*
Карэктар *Ю. М. Уланава*

Падпісана да друку 24.03.2015. Фармат 84×100 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 17,2.
Ул.-выд. арк. 17,4. Тыраж 1000 экз. Зак. 119.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск. http: //belarusbook.by.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.